# Імёны
# ў гісторыі універсітэта

*А.А.ЯНОЎСКІ, А.Г.ЗЕЛЬСКІ*

## ЯЗЭП ПЯТРОВІЧ КАРАНЕЎСКІ

У 1929 г., калі разгарнулася барацьба супраць так званага нацыянал-дэмакратызму, быў адхілены ад пасады і праз год арыштаваны першы рэктар БДУ Уладзімір Іванавіч Пічэта. Новым рэктарам быў абраны правадзейны член Інбелкульта, намеснік рэктара БДУ Язэп Пятровіч Каранеўскі, які ўжо шмат год працаваў у сістэме адукацыі Беларусі.

Нарадзіўся Язэп Каранеўскі ў мястэчку Заслаўе Мінскага павета 31 снежня 1887 г. (11 студзеня 1888 г.). Бацькі, як і большасць жыхароў мястэчка, займаліся сельскай гаспадаркай. Жылі Каранеўскія не багата, але і беднякамі не лічыліся – звычайная сярэдняя беларуская сям'я[1]. У 1909 г. Язэп скончыў настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне. Некаторы час настаўнічаў, а потым паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут, які скончыў у 1914 г. Уладкаваўся працаваць выкладчыкам ў Мінскі настаўніцкі інстытут, які ў хуткім часе быў эвакуіраваны ў Яраслаўль.

У маі 1918 г. Я.П.Каранеўскі прыбыў у Мінск, дзе вёў перамовы з Радай і Народным сакратарыятам БНР аб вяртанні інстытута. У выніку ўжо ў верасні настаўніцкі інстытут вярнуўся ў Мінск. У хуткім часе Язэп Каранеўскі становіцца намеснікам маршалка педагагічнай Рады Мінскага беларускага педагагічнага інстытута. Гэты інстытут заклаў падмурак для арганізацыі пачатковай і сярэдняй школьнай адукацыі, настаўніцкіх курсаў, распачаў працу па выданні школьных падручнікаў на беларускай мове.

У 1919–1920 гг. Язэп Пятровіч працаваў школьным інспектарам і выкладчыкам геаграфіі Мінскай беларускай гімназіі[2]. Ужо ў верасні 1920 г. яго як актыўнага камуніста прызначылі намеснікам Наркама асветы ССРБ. Наркамат у той час узначальваў А.Р.Чарвякоў, але хутка ён стаў старшынёй ЦВК і СНК ССРБ. Абавязкі наркама асветы былі ўскладзены на У.М.Ігнатоўскага. Але яго ў гэты час на Беларусі не было[3]. Уся праца па стварэнні наркамата легла на плечы яго намеснікаў – Я.Каранеўскага і М.Фрумкінай (апошняя выконвала абавязкі наркама асветы да сакавіка 1921 г.). У адпаведнасці са сваім становішчам намесніка наркама Я.П.Каранеўскі ўвайшоў у склад універсітэцкай камісіі пры НКА, якая аднавіла падрыхтоўку да адкрыцця універсітэта ў Мінску. У камісію, акрамя прадстаўнікоў НКА, увайшлі члены Мінскай і Маскоўскай камісій садзейнічання стварэнню універсітэта[4].

У гэты час канчаткова сфарміраваліся палітычныя і нацыянальныя погляды Я.П.Каранеўскага. У пачатку 1921 г. 32 камуністы, у тым ліку і Я.Каранеускі, звярнуліся з заявaю ў ЦБ КП(б)Б. «Заява 32-х» патрабавала перавесці школы, прэсу на беларускую мову, стварыць пры ЦБ КП(б)Б беларускую секцыю для правядзення неабходных мерапрыемстваў па беларусізацыі. Заява была станоўча разгледжана ў ЦБ КП(б)Б, з ёй шмат у чым пагадзіліся,

і небяспечных вынікаў для тых, хто яе падпісаў, яна не мела[5]. Але, як паказаў час, – да пары.

Тады ж, па даручэнню А.Р.Чарвякова, Я.Каранеўскі распрацоўвае праект пастановы для сесіі ЦВК ССРБ, які быў прыняты сесіяй у выглядзе звароту да ўсіх беларускіх работнікаў культуры, якія знаходзіліся ў Расіі і на Украіне, каб яны вярталіся працаваць на Беларусі. Рашэннем ЦВК пры наркамаце асветы быў створаны спецыяльны грашовы фонд дзеля аказання дапамогі тым, хто вяртаецца на Беларусь. У выніку гэтых мерапрыемстваў у ССРБ прыехала вялікая колькасць беларускіх настаўнікаў і навукоўцаў з Адэсы, Яраслаўля, Масквы, Петраграда і іншых месцаў[6]. Па даручэнні У.М.Ігнатоўскага Я.Каранеўскі складаў спісы жадаючых прыехаць на Беларусь, вёў з імі перапіску. Нягледзячы на тое, што неўзабаве яго замяніў на пасадзе намесніка наркама С.З.Кацэнбоген, Язэп Пятровіч яшчэ доўга заставаўся «правай рукой» Ігнатоўскага ў наркамаце асветы. Па водгуках сучаснікаў, Усевалад Ігнатоўскі высока ацэньваў Каранеўскага і ў размовах неаднаразова падкрэсліваў: «мой Каранеўскі», «даручу майму Каранеўскаму»[7].

Наркамат асветы размяшчаўся ў той час на рагу вуліцы Захар'еўскай і Архірэйскага завулка (дом Баршча). Я.П.Каранеўскі ўзначаліў у ім Галоўнае ўпраўленне сацыяльнага выхавання, працягваючы працаваць тут да 1925 г. Быўшы членам калегіі наркамата, ён адначасова з'яўляўся загадчыкам Белпедтэхнікума[8]. Разам з Я.Лёсікам, С.Вальфсонам, М.Грамыкам, У.Пічэтам, У. Дружчыцам 16 студзеня 1925 г. Я.Каранеўскі быў зацверджаны правадзейным членам Інбелкульта[9]. Акрамя гэтага, ён быў абраны ў Прэзідыум як намеснік У.Ігнатоўскага – старшыні Інбелкульта. У гэтым годзе жыццёвы шлях Я.П.Каранеўскага зноў сышоўся з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. 26 жніўня 1925 г. СНК Беларусі прыняў пастанову аб адкрыцці ў БДУ факультэта права і гаспадаркі. Наркамат асветы прызначыў Я.Каранеўскага старшынёй камісіі па прыёму студэнтаў на новастворany факультэт[10].

У 1927 г. Я.П.Каранеўскага прызначаюць прарэктарам Камуністычнага універсітэта імя У.І.Леніна ў Мінску. Але працаваць на гэтай пасадзе яму доўга не прыйшлося. У кастрычніку 1928 г., у сувязі з прызначэннем намесніка рэктара БДУ С.З.Слоніма першым намеснікам наркама асветы, Я.П.Каранеўскі быў уведзены ў склад праўлення БДУ ў якасці намесніка рэктара[11]. Новы намеснік рэктара займаўся вялікім колам вучэбных, адміністрацыйна-гаспадарчых і іншых пытанняў. 19 лістапада універсітэт наведаў А.В.Луначарскі. Наркам асветы СССР сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі, азнаёміўся з ходам будаўніцтва універсітэцкага гарадка, урачыста закладзенага год таму, агледзеў лабараторыі фізіка-матэматычнага аддзялення педфака. У заалагічным музеі наркам сфатаграфаваўся з намеснікам рэктара БДУ Я.П.Каранеўскім і намеснікам наркама асветы БССР С.З.Слонімам[12].

У гэты час універсітэт ужо стаў буйной вышэйшай навучальнай установай рэспублікі. Ён складаўся з чатырох факультэтаў: рабочага, педагагічнага, медыцынскага, права і гаспадаркі. Па стану на 1 кастрычніка 1927 г. на ўсіх факультэтах вучылася 2672 студэнты і працавала 257 навукоўцаў, у тым ліку 49 прафесараў і 51 дацэнт. Летам 1928 г. было прынята рашэнне аб стварэнні хіміка-тэхналагічнага факультэта. Вялося будаўніцтва новага універсітэцкага гарадка. У рэчышчы агульнадзяржаўнай палітыкі беларусізацыі універсітэт паступова пераходзіў на беларускую мову выкладання, без шкоды для вывучэння і выкарыстання іншых моў БССР. Больш за ўсё быў беларусізаваны педфак, на якім у 1927 г. 65% вучэбных гадзін выкладалася на беларускай мове, 15 – на яўрэйскай, 20% гадзін – на рускай[13].

Па абавязках прарэктара Я.П.Каранеўскі займаўся пытаннямі студэнцкага жыцця, уладкаваннем выпускнікоў БДУ на працу. У той час высветлілася, што большасць выпускнікоў імкнулася ўладкавацца на працу ў Мінску і іншых буйных гарадах, не жадаючы працаваць у вёсцы. Лепшым сродкам у барацьбе

з гэтай з`явай былі прызнаны «чысткі чужых элементаў»[14]. Выключэнне з БДУ і іншых навучальных устаноў «непралетарскага элемента» пачалося яшчэ ў сярэдзіне 20-х гг., але ў 1928–1929 гг. яно набыло велізарны размах. Газеты стракацелі загалоўкамі: «Неослабевающая классовая бдительность», «Вынікі праверкі студэнтаў ВНУ БССР», «Классовый враг проявляет активность», «Чуждый элемент получает стипендию в БГУ», «Пролетарское студенчество дает отпор национал-шовинистам»...

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б 28 лістапада 1928 г. азначыў, што ўся партыя «павінна быць асабліва пільнай у барацьбе супраць ухілаў, а ў дадзены момант асабліва ў барацьбе супраць найбольш небяспечнага правага ўхілу... узмацніць барацьбу супраць нацыянал-дэмакратызму і шавінізму»[15]. Так на Беларусі пачаў раскручвацца махавік рэпрэсій па барацьбе з «контррэвалюцыйнай нацдэмаўшчынай».

Згушчаліся хмары над галовамі сяброў і калег Язэпа Пятровіча. Носьбіты «праваўхільных поглядаў» хутка былі знойдзены сярод інтэлегенцыі: дзеячоў навукі, культуры, што працавалі ў Інбелкульце, наркамаце асветы, навучальных установах, творчых саюзах. Хвалі афіцыйнай крытыкі абрынуліюя на наркама асветы А.В.Баліцкага, прэзідэнта Беларускай акадэміі навук У.М.Ігнатоўскага.

У кастрычніку 1929 г. ад абавязкаў рэктара БДУ быў вызвалены У.І.Пічэта, 11 кастрычніка абноўленае праўленне абрала рэктарам БДУ Язэпа Пятровіча Каранеўскага[16]. Выбар выкладчыкаў і студэнтаў 15 кастрычніка зацвердзіў наркамат асветы БССР. Гэта былі апошнія выбары рэктара універсітэта. Камуністычная партыя ўзмацніла кантроль за навучальнымі ўстановамі. У канцы кастрычніка ва універсітэце было ўведзена адзінаначалле. Была вызначана асабістая адказнасць рэктара за стан спраў ва універсітэце, а дэканаў – на факультэтах. Члены праўлення сталі прызначацца. Саветы аддзелаў і іх бюро як органы кіравання расфарміроўваліся, студэнцкія арганізацыі вызваляліся ад адміністрацыйна-педагагічных функцый.

Перад новым рэктарам паўсталі шматлікія задачы, якія неабходна было хутка вырашаць. Універсітэцкі гарадок будаваўся маруднымі тэмпамі, нягледзячы на шматлікія суботнікі з удзелам студэнтаў. Вучэбных памяшканняў не хапала. Але горш за ўсё было становішча з пражываннем студэнтаў і выкладчыкаў. З-за адсутнасці месц у інтэрнатах студэнты вымушаны былі начаваць у скверах і на вакзале[17]. Я.П.Каранеўскі звярнуўся ў ЦК КП(б)Б з просьбай аб выдзяленні сродкаў на будаўніцтва студэнцкага інтэрната. Язэп Пятровіч здолеў дамагчыся павелічэння стыпендыяльнага бюджэту універсітэта на 55% у параўнанні з 1928 г. Новастораны хіміка-тэхналагічны факультэт забяспечваўся стыпендыямі на 75%.

Кіраўніцтва БДУ добра зразумела, што ў асвятленні і арганізацыі жыцця навучальнай установы вялікую ролю адыгрывае газета. І вось 27 лістапада 1929 г. выйшаў першы нумар універсітэцкай газеты «Ленінскім шляхам» (пасля газета мела назвы: «За ленінскія кадры», «За сталінскія кадры», а з 1955 г. – «Беларускі універсітэт»).

Я.П.Каранеўскаму давялося вырашаць і складаныя праблемы пашырэння універсітэта. Найбольш прымальным тады здавалася ствараць на базе існуючых факультэтаў асобныя аддзяленні, каб пасля ператвараць іх у факультэты. Так, у снежні 1929 г. па прапанове рэктара на факультэце права і гаспадаркі былі створаны прававое, эканамічнае і кааператыўнае аддзяленні.

Але падзеі апярэдзілі Язэпа Пятровіча. У 1929 г. СНК СССР, а пасля СНК БССР прынялі пастановы аб рэарганізацыі форм працы вышэйшых навучальных устаноў. Час паказаў памылковасць гэтай рэарганізацыі вучэбна-метадычнай работы. Згодна з пастановай СНК БССР, у БДУ адмянялася заліковая сістэма праверкі ведаў студэнтаў. Аснову навучальнага працэсу цяпер складалі семінарскія заняткі. Уводзілася брыгадная форма навучання і праверкі ведаў. Ад гэтага сур`ёзна пацярпела падрыхтоўка спецыялістаў.

Навучальны 1929/1930 год аказаўся бесперапынны, без агульных выхадных дзён і канікул, у той жа час былі адменены дыпломныя работы і абавязковае наведванне лекцый[18]. Гэта стварала няўстойлівасць універсітэцкага жыцця.

Згодна рашэнням ліпеньскага (1928 г.) Пленума ЦК ВКП(б), на ўсіх факультэтах універсітэта былі перагледжаны вучэбныя планы з мэтай набліжэння тэорыі да практыкі будаўніцтва сацыялізму. Уводзіліся прамысловая, агранамічная, школьная практыкі, а таксама новыя вытворчыя дысцыпліны: электратэхніка, машынабудаванне, тэхналогія металаў і інш.

Аднак і тут выявіліся яўныя перакосы. Так, на хімфаку ўводзілася бесперапынная вытворчая практыка, а прамысловасць не ў стане была забяспечыць прыём студэнтаў-практыкантаў. Я.П.Каранеўскі як кандыдат у члены ЦВК БССР неаднаразова ўздымаў на партыйных пасяджэннях пытанне аб навучанні і практыцы студэнтаў. У прыватнасці ён адзначаў, што крымінальны вышук накіроўвае студэнтаў-практыкантаў лавіць курэй, што школы выкарыстоўваюць педпрактыку не па прызначэнні, што з-за мітынгаў і дэманстрацый, на якіх абавязкова прысутнічаюць камсамольцы БДУ, зрываюцца заняткі[19].

Такія выказванні рэктара БДУ ужо тады маглі яму дорага каштаваць, але партыйная чыстка 1929 г. яго не закранула. Партыйная характарыстыка таго часу так вызначала асабістыя якасці рэктара БДУ: «Каранеўскі мае мяккі характар, і недастаткова моцны і мяккі адміністратар. У партыйнай рабоце малавопытны і палітычна развіты...»[20] Сапраўды, Язэп Пятровіч быў чалавекам не вельмі вопытным ў партыйных інтрыгах. Ён працягваў дабрасумленна займацца справамі, разумеючы вострую неабходнасць развіцця беларускай адукацыі, навукі, культуры.

Па ініцыятыве Я.П. Каранеўскага 19 лютага 1930 г. было прынята рашэнне стварыць на базе праўгаса два факультэты народнай гаспадаркі: савецкага будаўніцтва і права і факультэт народнай гаспадаркі, а на базе педфака – НДІ педагогікі і педалогіі. Адначасова ішло стварэнне дадатковых аддзяленняў на педагагічным факультэце: завочнага, хімічнага, палітыка-асветніцкага, а ў планах – газетна-выдавецкага, закладваўся універсітэцкі батанічны сад.

1 жніўня 1930 г. на базе медфака БДУ быў створаны самастойны медыцынскі інстытут. Яму адышлі два новапабудаваныя корпусы: медыцынскі і анатамічны. Дабудоўваліся біялагічны, хімічны і галоўны адміністрацыйны корпусы БДУ. Праца ішла марудна з-за прастояў і недахопу матэрыялаў, што вельмі непакоіла Я.П.Каранеўскага.

А жыццё, якое потым гісторыкі назавуць часам умацавання сталінскай дыктатуры, усё больш урывалася ў сцены універсітэта. У 1930 г., калі быў арыштаваны У.І.Пічэта, былы першы рэктар БДУ, узмацняюцца абвінавачванні супраць прэзідэнта акадэміі Усевалада Ігнатоўскага і Янкі Купалы.

Што можна было рабіць у такіх умовах? Язэп Пятровіч працаваў. Ён чытаў лекцыі, наладжваў сустрэчы з беларускімі і расійскімі пісьменнікамі, імкнуўся пашырыць вядомасць БДУ на Беларусі і ў СССР. У самым пачатку новага навучальнага года, 3 верасня, было завершана будаўніцтва універсітэцкага гарадка. Загадам рэктара пашыраўся прыём у БДУ: да 550 чалавек восеньскага прыёму намячалася прыняць дадаткова ў зімовы перыяд яшчэ 435 чалавек. БДУ накіраваў сваіх прадстаўнікоў на буйныя прадпрыемствы Бабруйска, Віцебска, Гомеля для папулярызацыі набора.

Рэктар імкнуўся актывізаваць і навукова-даследчую працу студэнтаў. Пры факультэтах ствараліся студэнцкія навуковыя таварыствы. Працягвала працаваць навукова-даследчае таварыства краязнаўства, якое ўзначальваў сам Я.П.Каранеўскі[21]. Паляпшаліся быт і матэрыяльная забяспечанасць студэнтаў. Ва універсітэцкім гарадку працавала танная студэнцкая сталовая, 60–70% студэнтаў былі забяспечаны стыпендыямі, быў здадзены пад жыллё новы інтэрнат, праўда без вадапровада і электрычнасці[22].

Новы 1931 г. пачаўся з цяжкасцей. У сувязі з перабоямі ў пастаўках паліва Рада дырэктараў Мінска прыняла пастанову зрабіць зімой месячны перапынак на занятк ў ВНУ і тэхнікумах горада[23]. Аднак гэта не было вельмі страшэннай навіной. 4 лютага стала вядома, што пасля допытаў у АДПУ застрэліўся старэйшы сябра і паплечнік Каранеўскага, прэзідэнт БелАН Усевалад Ігнатоўскі. Як на гэта рэагаваў Язэп Пятровіч – невядома. Але грозныя хмары ўжо збіраліся і над ім. 21 лютага 1931 г. ЦКК ВКП(б) запатрабавала ад ЦКК КП(б)Б матэрыялы аб У.М.Ігнатоўскім. У дакладной запісцы ў адрас ЦК і асабіста Л.Кагановіча побач з прозвішчамі А.Крыніцкага, А.Чарвякова, І.Адамовіча, З.Жылуновіча, А.Бурбіса, Б.Стасевіча стаяла прозвішча Я.Каранеўскага[24].

Але ж у гэты час БДУ рыхтаваўся ўрачыста адзначыць дзесяцігоддзе з дня адкрыцця. Ганарыцца сапраўды было чым. З 1922 г. толькі колькасць студэнтаў вырасла з 1126 да 2332. (Тут неабходна ўлічыць, што медфак ужо быў ператвораны ў самастойны інстытут.) У БДУ працавалі 302 вучоныя розных галін ведаў.

Да свята, якое ўрачыста было адзначана 11 ліпеня, праўленне БДУ атрымала шмат віншаванняў. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР былі ўзнагароджаны прафесары С.Вальфсон і П.Панкевіч, званне заслужанага дзеяча навукі было прысвоена 12 вучоным. Рэктар жа Я.Каранеўскі быў узнагароджаны толькі Ганаровай граматай СНК БССР і ўжо 28 ліпеня загадам наркама асветы вызвалены ад пасады[25]. Заставацца на Беларусі было небяспечна і Я.П.Каранеўскі пераязджае ў Маскву, дзе атрымлівае пасаду намесніка дырэктара па вучэбнай частцы Інстытута Чырвонай прафесуры сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі. На гэтай пасадзе ён працаваў да 15 ліпеня 1937 г., калі быў арыштаваны. Справу Я.П.Каранеўскага як "актыўнага ўдзельніка контррэвалюцыйнай арганізацыі" запатрабаваў НКУС БССР. Язэпа Пятровіча этапіравалі з Масквы ў Мінск.

У справе Я.П.Каранеўскага фігуруе толькі адзін пратакол допыту ў верасні 1937 г. Праз якія ж фізічныя і псіхалагічныя катаванні павінен быў прайсці чалавек, каб агаворваць сябе ў неіснуючых злачынствах, прызнавацца ў шпіянажы на карысць Польшчы, у контррэвалюцыйнай і нацфашысцкай дзейнасці, абвінавачваць сваіх нядаўніх таварышаў у нацдэмаўшчыне і шкодніцтве? Тое, што ўсё гэта хлусня, было ясна нават тады. Так, сярод удзельнікаў контррэвалюцыйнай арганізацыі ў Маскве Я.Каранеўскі называў Ул.Пічэту, які ў той час знаходзіўся ў ссылцы, і нябожчыка Ігнатоўскага. Каранеўскі не можа прыгадаць усіх прозвішчаў тых, хто быў скіраваны для «нацфашистской работы в БССР», але пераказвае на памяць гутарку, якую нібыта вёў Ю.Пілсудскі з ім і Алесям Гаруном ў Мінску ў 1920 г.[26]

Але для следства гэта было неістотным. Галоўнае – прызнанні абвінавачанага, тым больш, што ўся дзейнасць Язэпа Пятровіча "сведчыла" цяпер супраць яго: стварэнне і праца ў Беларускай камуністычнай арганізацыі – «связь с белопольскими агентами», «шпионаж в пользу Польши», лекцыі ў БДУ – «протаскивание нацфашистской контрабанды», работа па вяртанню беларускіх кадраў з-за мяжы – «переброска нацфашистов в Минск и создание нацфашистских ячеек» і г.д.[27]

На судовым пасяджэнні выязной сесіі Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР 28 кастрычніка 1937 г. Язэп Пятровіч Каранеўскі быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Суд, калі яго можна так назваць, доўжыўся 15 хвілін...[28] Верагодна (што пацвярджаецца дакументамі), Язэп Пятровіч Каранеўскі расстраляны на другі дзень пасля вынясення прыгавору – 29 кастрычніка.

У 1956 г. па хадайніцтву П.Г.Каранеўскай, жонкі Я.П.Каранеўскага, якая нічога не ведала пра лёс мужа амаль 20 год і сама з трохгадовым сынам Юрыем адбыла пяцігадовую ссылку, пракуратура Саюза ССР перагледзела справу[29].

У 1957 г. Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР па заключэнні Галоўнага ваеннага пракурора прызнала, што Язэп Пятровіч Каранеўскі быў арыштаваны і асуджаны неабгрунтавана, і прысуд у адносінах да яго адмяніла з-за адсутнасці складу злачынства[30].

Так, праз 20 гадоў былі рэабілітаваны не толькі імя другога рэктара БДУ, але і амаль двухгадовая дзейнасць універсітэта, з якой былі зняты зняважлівыя ярлыкі.

[1] Архіў КДБ РБ. Спр.16406-С, л.4.
[2] Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.4. С.110.
[3] Ігнаценка І., Кароль А. Усевалад Ігнатоўскі і яго час. Мн., 1991. С.22.
[4] НАРБ. Ф.205, воп.1, спр.2, л.33.
[5] Архіў КДБ РБ. Спр.16406-С, л.31–32.
[6] Там жа. Л.33.
[7] Там жа. Л.52.
[8] Вестник НКП БССР. 1925. №1. С.12.
[9] Там жа. №4. С.2.
[10] НАРБ. Ф.205, воп.1, спр.163, л.1.
[11] У праўленні БДУ // Савецкая Беларусь. 1928. 26 кастр.
[12] Архіў Музея гісторыі БДУ.
[13] Пічэта У.І. Беларускі Дзяржаўны Універсітэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі // Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921–1927. Мн., 1927. С.27–28.
[14] К ответу дезертиров культурного фронта // Рабочий. 1929. 7 окт.
[15] КПБ у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў і пленумаў ЦК. Мн., 1984. Т.2. С.42.
[16] НАРБ. Ф.205, воп.1, спр.375, л.1,16.
[17] Звязда. 1929. 24 верасня.
[18] Белорусский государственный университет им. В.И.Ленина. Мн., 1971. С.27–28.
[19] Неабходны пералом // Звязда. 1929. 17 снежня.
[20] Архіў КДБ РБ. Спр.16406-С, л.100.
[21] Архіў Музея гісторыі БДУ.
[22] Савецкая Беларусь. 1930. 19 верасня.
[23] Кожушков А.И., Яновский О.А. Белорусский университет. Хроника событий. Мн., 1991. С.45.
[24] Ігнаценка І., Кароль А. Назв. твор. С.113.
[25] НАРБ. Ф.205, воп.1, спр.470, л.10.
[26] Архіў КДБ РБ. Спр.16406-С.
[27] Там жа. Л.16,21,35,37.
[28] Там жа. Л.65,66,68.
[29] Там жа. Л.69.
[30] Там жа. Л.105–109.